УДК 327.7(476)

# БЕЛАРУСЬ І ПРАБЛЕМА АДМЕНЫ СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ Ў МІЖНАРОДНЫХ АКТАХ ААН

**В. В. ВАЛЖАНКОЎ, А. В. МАКСІМІК**
Магілеўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь
Магілёў, Беларусь

Адным з прынцыпаў міжнароднага права з'яўляецца павага правоў і свабод чалавека, а найважнейшым правам чалавека – права на жыццё. Права на жыццё замацавана ў многіх міжнародна-прававых актах. У арт. 3 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 1948 г. гаворыцца, што «кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць». Згодна з арт. 5 Дэкларацыі, «ніхто не павінен падвяргацца катаванням або жорсткім, бесчалавечным і прыніжаючым яго годнасць абыходжанню і пакаранням» [1]. Арт. 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах 1966 г. абвяшчае: «Права на жыццё ёсць неад'емнае права кожнага чалавека. Гэта права ахоўваецца законам. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жыцця» [3].

Зваротным бокам права на жыццё з'яўляецца смяротнае пакаранне. Смяротнае пакаранне – гэта найбольш суровая мера пакарання, бо яна прыводзіць да пазбаўлення самага каштоўнага, што ёсць у чалавека, – яго жыцця, прычым страта гэтая з'яўляецца незваротнай.

Такім чынам, смяротнае пакаранне супярэчыць прынцыпу права на жыццё, які стаіць на чале міжнароднага права, і таму нядзіўна, што міжнароднае права ідзе па шляху яе поўнай адмены, прадпісваючы дзяржавам адмовіцца ад гэтага віду пакарання.

Мэта міжнароднага права ў пытанні аб смяротнай кары сфармуляваная ў Рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН 32/61 ад 8 снежня 1977 г.: «... гэта прагрэсіўнае абмежаванне колькасці злачынстваў, якія караюцца смяротным пакараннем, пры выказванні жадання адмовы ад гэтай меры пакарання» [6].

Міжнароднае права не забараняе прымяненне смяротнага пакарання за найбольш цяжкія злачынствы. Аднак Другі Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах прапануе ўсім дзяржавам ўвесці забарону на такі выгляд крымінальнага пакарання [2]. У цяперашні час Камітэт ААН па правах чалавека заклікае дзяржавы свету ратыфікаваць гэты дакумент [2].

Члены Камітэта па правах чалавека лічаць, што пытанне смяротнага пакарання нельга лічыць толькі адным з аспектаў ўнутранай палітыкі кожнай дзяржавы, паколькі ён тычыцца самога базавага права чалавека – права на жыццё.

Каментарый Генеральнага сакратара ААН Пан Гі Муна адносна разглядаемага пытання адлюстроўвае агульнасусветную тэндэнцыю адмовы ад вышэйшай меры пакарання [5]. Усё больш дзяржаў-членаў ААН прызнаюць, што смяротнае пакаранне падрывае чалавечую годнасць, а яго адмена ці мараторый на яго прымяненне, спрыяюць пашырэнню і прагрэсіўнаму развіццю правоў чалавека.

У адпаведнасці з рэзалюцыямі ААН, якія заклікаюць да паступовай адмовы ад вышэйшай меры пакарання, Упраўленне ААН па правах чалавека падтрымлівае дзяржавы-члены, грамадзянскую супольнасць і іншыя зацікаўленыя бакі, якія выступаюць за ўвядзенне мараторыя на смяротнае пакаранне і ў выніку за яе адмену ва ўсім свеце.

У цяперашні час у свеце назіраецца два супрацьлеглыя працэсы, якія тычацца смяротнага пакарання.

З аднаго боку, ідзе скарачэнне прымянення смяротнага пакарання. Па апошняй інфармацыі, сёння час з 185 краін-членаў ААН 112 адмянілі смяротнае пакаранне, а з 73 астатніх меньш за 40 фактычна не прыводзілі ў выкананне гэта пакаранне на працягу апошніх гадоў.

З другога боку, працэс скарачэння прымянення смяротнага пакарання ідзе не ўсюды. З 1965 г. каля 50 краін пашырылі пералік злачынстваў, за якія можа быць прызначана пакаранне смерцю [4].

11 лістапада 2014 г. у Нью-Ёрку на пасяджэнні Трэцяга камітэта Генеральнай Асамблеі ААН па ініцыятыве міжрэгіянальнай групы дзяржаў была прынята рэзалюцыя «Мараторый на прымяненне смяротнага пакарання» [4]. Сааўтарамі дакумента сталі больш за 80 дзяржаў-членаў ААН, аднак Беларусь у іх лік не ўвайшла.

Увогуле рэгіён Усходняй Еўропы ўяўляе сабой унікальную карціну ўсіх стадый працэсу адмены смяротнага пакарання: Украіна адмяніла смяротнае пакаранне заканадаўча, Расія не прымяняе смяротнае пакаранне на практыцы, Беларусь працягвае ўжываць гэты від пакарання. Пры тым, што Беларусь і Расія – апошнія краіны ў Еўропе, якія не адмянілі заканадаўча смяротнае пакаранне, неабходна адзначыць, што канстытуцыі абедзвюх краін падкрэсліваюць выключны і часовы характар гэтай меры. Беларусь – адзіная краіна ў Еўропе, якая прыводзіць смяротныя прысуды ў выкананне. Смяротнае пакарання прадугледжана за 14 крымінальных злачынстваў (12 у мірны час і два у ваенны) [7, с. 80–208].

На працягу апошніх 10 гадоў улады Беларусі зрабілі на розных нацыянальных і міжнародных форумах нямала заяў, якія паказваюць тое, што краіна рухаецца да прыняцця мараторыя на смяротнае пакаранне. Варта заўважыць, што ў апошнія 10 гадоў у Беларусі колькасць пакаранняў смерцю істотна знізілася. У Беларусі грамадская думка адносна смяротнага пакарання адыгрывае важную ролю ў захаванні гэтага прысуду, і заканадаўцы працягваюць карыстацца падтрымкай большай часткі насельніцтва, якая выступае супраць адмены смяротнай кары.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Всеобщая декларация прав человека // Национальный правовой интернет-портал Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // www.pravo.by/world_of_law/text.asp?RN=i04800004. – Дата доступа : 10.10.2015.

2. Второй Факультативный протокол к Международному пакту о гражданских и политических правах, направленный на отмену смертной казни // Конвенции и соглашения Организации Объединенных Наций [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/deathpro.shtml. – Дата доступа : 01.10.2015.

3. Международный пакт о гражданских и политических правах // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // www.pravo.by/main.aspx?guid=3961&p0=I06600002. – Дата доступа : 09.10.2015.

4. Отмена смертной казни во многих государствах мира – одно из важнейших достижений за 70 лет деятельности ООН // Центр новостей ООН [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // www.un.org/russian/news/story.asp?NewsID=24463#.Vh-XVCK8-sk. – Дата доступа : 15.09.2015.

5. Пан Ги Мун будет добиваться отмены смертной казни в мире // ЛИГА.Новости [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // news.liga.net/news/world/3629528-pan_gi_mun_budet_dobivatsya_otmeny_smertnoy_kazni_v_mire.htm. – Дата доступа : 30.09.2015.

6. Резолюция Генеральной Ассамблеи ООН 32/61 // Генеральная ассамблея Организации Объединенных Наций [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // www.un.org/ru/ga/32/docs/32res.shtml. – Дата доступа : 07.10.2015.

7. Уголовный кодекс Республики Беларусь : с изм. и доп. по состоянию на 24 окт. 2013 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2013. – 304 с.